# ВАША СЛОВА, ТАВАРЫШ МОВА!

**Сюррэалізм – эстэтычны напрамак у мастацтве. Адрозніваецца выкарыстаннем алюзій і парадаксальных спалучэнняў формаў. Сюррэалісты былі натхнёныя радыкальнай левай ідэалогіяй, аднак рэвалюцыю яны прапаноўвалі пачаць са сваёй свядомасці. Мастацтва ўяўлялася імі асноўным інструментам вызвалення. Найпершай мэтай сюррэалістаў было духоўнае ўзвышэнне і аддзяленне духу ад матэрыяльнага. Аднымі з найважнейшых каштоўнасцяў з'яўляліся свабода, а таксама ірацыянальнасць…**

Напрамак у мастацтве… А яно, у сваю чаргу, – не што іншае, як адлюстраванне жыцця. Пачаць са сваёй свядомасці… Ці так гэта проста ва ўзаемаадносінах з роднай, беларускай мовай? Адказ спрабавалі знайсці 25 лютага, падчас чарговага, 72-га па ліку пасяджэння створанага Гродзенскім абласным аддзяленнем СПБ грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром»; тэма «Пра мову на мове». Чым выклікана такая тэма? Па-першае, нашай клубнай традыцыяй прысвячаць кожнае лютаўскае пасяджэнне святу – Міжнароднаму дню роднай мовы (у вольным доступе можна знайсці інфармацыю аб яго ідэях і гісторыі). Па-другое, вядомым стаў выраз-слоган «Гавары не *пра* мову, а *на* мове!» Ну і вядома, асаблівай падзеяй, не сумняваюся, стала чарговае выязное пасяджэнне клуба. На жаль, адносіны праекта з моладдзю пакуль не ладзяцца, неабходна гэта прызнаць. Моладзь да нас не ходзіць, не рэагуе нават на афіцыйныя запрашэнні ў БРСМ, не праяўляе імпэту. Таму наша спроба прыйсці да моладзі – мера вымушаная. Спачатку я нават планаваў назваць справаздачны рэпартаж «Магамет прыйшоў да гары» (раз ужо гара не ідзе да Магамета). Але потым я падумаў, што гэтае навешванне метафарычных цэтлікаў – хто з нас хто – не выглядае карэктным. Лакацыяй для лютаўскай сустрэчы-2026 стала Гродзенская гімназія № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага. Вось яно – падумалася – амаль фантастычная постаць, «Жалезны Фелікс»... Каб сёння была яго воля, усе загаварылі б на роднай мове ў вельмі сціслы тэрмін.




…Асноўнае паняцце сюррэалізму, сюррэальнасць — сумяшчэнне сну і рэальнасці. Для гэтага сюррэалісты прапаноўвалі абсурднае, супярэчлівае спалучэнне натуралістычных вобразаў з дапамогай калажа і тэхналогіі «ready-made»… Добра, думалася мне, калаж дык калаж. Парадокс дык парадокс. Але што далей? Да ўсіх нас вельмі гуманна, па-сяброўску паставіліся нашы новыя знаёмыя – адміністрацыя шостай гімназіі ў асобе дырэктара Аксаны Іванаўны Аўдзітоўскай, а таксама гэта: намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Аліна Віктараўна Салімава; намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Таццяна Вітальеўна Паўлюкевіч; настаўнік гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Іна Валер’еўна Соркіна. Мадэратарам пасяджэння выступіла пісьменніца-педагог, кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб'яднання «Надзея», настаўнік беларускай мовы і літаратуры Юлія Аляксандраўна Чамярыс. Менавіта Юліі Аляксандраўне клуб абавязаны запрашэннем у госці да вучняў і педагогаў гімназіі. Ініцыятыва проста неацэнная!



У госці да гімназістаў прыйшлі цэлыя чатыры (4!) члены СПБ (з варыянтам «сябры», прабачце, я не пагаджуся) на чале са старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ, заслужаным дзеячам культуры Беларусі Людмілай Антонаўнай Кебіч, а таксама, акрамя мяне, – супрацоўнік прэс-службы СПБ-Гродна, паэт, блогер Анатоль Уладзіміравіч Апанасевіч і кандыдат гістарычных навук, дацэнт, публіцыст-гісторык Уладзімір Яўгенавіч Ягорычаў. З боку гасцей у выязным пасяджэнні клуба таксама паўдзельнічалі гродзенскія літаратары, педагогі, ветэраны працы, грамадскія актывісты. Пытанні, пастаўленыя перад клубам, тычыліся Міжнароднага дня роднай мовы і яго спецыфікі ў Беларусі. Чаму міжнароднае свята ў шматнацыянальным беларускім грамадстве часцяком выглядае як свята беларускіх нацыянальных традыцый, як своеасаблівы Дзень беларускасці (са стравамі беларускай кухні, нацыянальнымі строямі, рушнікамі і г. д.)? Што сёння для кожнага з нас родная мова? Як складваюцца адносіны з ёй? Як уплываюць на нацыянальныя мовы тэндэнцыі глабалізму і мультыкультуралізму? Чаму беларускую мову называюць «матчынай»? Як яе можна было б зрабіць паўсядзённай і ўсенароднай? Што гэтаму перашкаджае? Чаму на роднай мове з кожным годам гаворыць, на жаль, усё менш беларусаў? Як зацікавіць гэтай праблематыкай моладзь? Чым сёння магло б дапамагчы родным мовам маладое пакаленне? Якую ролю адыгрывае літаратура XXI стагоддзя ў лёсе нашых родных моў? Што для нас значаць паняцці «моўны патрыятызм», «экалогія мовы», «маўленчы этыкет»? Трэба адразу прызнацца, што закрануць удалося толькі частку з гэтага спісу пытанняў. Затое пагутарылі пра гісторыю беларускай мовы.

Трэба сказаць, што ў гімназіі нас сустрэлі ветліва. Мы сталі тут падзеяй. «Вы на скаладром?» – усхвалявана пыталіся хлапчукі мяне, незнаёмую асобу, яшчэ на вуліцы. Юлія Аляксандраўна Чамярыс *(на фота)* – чалавек вельмі сумленны, прагрэсіўны (і як творца, і як прафесіянал). Таму падрыхтаваная ёй праграма пасяджэння была ўспрынятая прадстаўнікамі розных пакаленняў з аднолькавай зацікаўленасцю. І што важна, лёгкая, гульнявая форма выклікала вострую дыскусію на сур'ёзныя тэмы. Трэба адзначыць праведзеную педагогам карпатлівую падрыхтоўчую працу з



падлеткамі. Я падумаў, што да такога кіраўніка грамадскага дыскусійнага клуба моладзь імкнулася б заўсёды, з зайздроснай стабільнасцю. Яшчэ адной добрай падзеяй стала наша знаёмства з маладым чалавекам па імені Арсень Шыцік. Арсень – студэнт-купалавец, вучыцца на журналіста. За яго візіт на наша клубнае, ды яшчэ выязное пасяджэнне варта падзякаваць універсітэцкаму выкладчыку Арсеня Аліне Эдмундаўне Сабуць. Што я і раблю: дзякуй Вам, Аліна Эдмундаўна! І дзякуй Вам, Арсень, за гатоўнасць цвёрда, прынцыпова адстойваць уласную пазіцыю, а таксама дзякуй за інфармацыйную падтрымку праекта. Хачу падзякаваць і Галіне Іванаўне Садоўскай, якая літаральна за некалькі хвілін арганізавала цэлы яркі тэматычны перфоманс з удзелам гімназістаў (вось што значыць вялізны прафесійны вопыт педагога, знаўцы душ дзіцячых). З усіх гасцей гімназіі ўдзел Галіны Іванаўны ў «Словадроме-72» я лічу найбольш яркім, а таму найбольш паспяховым і пераканаўчым *(глядзіце фота)*.



Сюррэалізм (ад французскага *surréalisme*, даслоўна – «звышрэалізм», «надрэалізм»). Менавіта сюррэалістычнай я знаходжу сітуацыю, калі народ спрабуе авалодваць сваёй роднай мовай, імкнецца папулярызаваць яе. Калі чалавек прызнаецца, што выхоўвае сваіх сыноў у рэчышчы беларускіх нацыянальных традыцый, у тым ліку і ў мове, гэта не павінна выглядаць чымсьці экстраардынарным. Па сутнасці гэта норма. Проза жыцця. Вядома, мае калегі выказаліся па вызначанай тэматыцы. З Арсенем мы даволі востра падыскутавалі пра настроі ў грамадстве. У фінале пасяджэння прагучалі аўтарскія вершы, прыгожыя оды, гімны, асанны, здравіцы нашай роднай мове. Сваё бачанне сітуацыі, сфармаванае за многія гады, я яшчэ больш умацаваў. Яно не ўсім падабаецца. Чым больш мы святкуем тое, што павінна быць нашымі буднямі, тым

больш негатыўны на выхадзе атрымліваем эфект. Колькі заўгодна можна праводзіць розных мерапрыемстваў, – на жаль, з кожным годам на роднай мове гавораць усё менш беларусаў. А гэта значыць, што рухаемся мы ў няправільным кірунку. Ужо прабачце. Свае перакананні, меркаванні, прапановы я пастараўся выкласці ў артыкуле. Артыкул – у кнізе. Кніга – яшчэ ў выдавецтве. Апярэджваць падзеі не стану. Сітуацыю, калі мы гаворым пра мову на мове, абмяркоўваем яе праблемы, гісторыю, спяваем ёй гімны, а потым, пасля заканчэння мерапрыемстваў зноў пераходзім на іншую мову і працягваем карыстацца менавіта ёю, я і называю сюррэалізмам. Каб не выказвацца больш рэзка.

Запрашаю ўсіх на наступнае, 73-е пасяджэнне ў наш

# общественный дискуссионный клуб

# «СЛОВОДРОМ»

## *ТЕМА ЗАСЕДАНИЯ:*

## ***«ЖЕНСКОЕ ЛИЦО БЕЛАРУСИ»***

**Встречаемся 25 марта 2026 года, в 17.00**

**в главном корпусе Гродненской областной научной библиотеки имени Е. Ф. Карского по адресу: г. Гродно, ул. Карбышева, 17; четвёртый этаж.**

**Заседание будет посвящено Году белорусской женщины**

С уважением, всегда ваш

Дмитрий Радиончик

**На фота:** 72-е пасяджэнне створанага Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі грамадскага дыскусійнага клуба «Словадром» (тэма «Пра мову на мове») было прысвечана святу – Міжнароднаму дню роднай мовы. Прайшла сустрэча дынамічна, займальна і востра. Дзякуй усім і асабліва прымаючаму боку – Гродзенскай гімназіі № 6 імя Ф. Э. Дзяржынскага (пасяджэнне было выязным). 25 лютага 2026 года.






Ініцыятар правядзення «Словадрома-72» у гімназіі, кіраўнік Гродзенскага гарадскога літаб’яднання «Надзея», пісьменніца-педагог Юлія Аляксандраўна Чамярыс




ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
прадстаўляе:
ГРАМАДСКІ ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ
«СЛОВАДРОМ»
ШТОГОД СВАЁ ЛЮТАЎСКАЕ ПАСЯДЖЭННЕ НАШ КЛУБ ПРЫСВЯЧАЕ МІЖНАРОДНАМУ ДНЮ РОДНАЙ МОВЫ (21.02). ТЭМА СУСТРЭЧЫ # 72: «ПРА МОВУ НА МОВЕ». ЧАМУ МІЖНАРОДНАЕ СВЯТА Ў ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ ЧАСЦЯКОМ ВЫГЛЯДАЕ ЯК СВЯТА БЕЛАРУСКІХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ, ЯК СВОЕАСАБЛІВЫ ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАСЦІ? ШТО СЁННЯ ДЛЯ КОЖНАГА З НАС РОДНАЯ МОВА? ЯК СКЛАДВАЮЦЦА АДНОСІНЫ З ЁЙ? ЯК УПЛЫВАЮЦЬ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МОВЫ ТЭНДЭНЦЫІ ГЛАБАЛІЗМУ І МУЛЬТЫКУЛЬТУРАЛІЗМУ? ЧАМУ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ НАЗЫВАЮЦЬ МАТЧЫНАЙ? ЯК, НА ВАШ ПОГЛЯД, МОЖНА ЗРАБІЦЬ ЯЕ ПАЎСЯДЗЁННАЙ І ЎСЕНАРОДНАЙ? ШТО ГЭТАМУ ПЕРАШКАДЖАЕ? ЧАМУ НА РОДНАЙ МОВЕ З КОЖНЫМ ГОДАМ ГАВОРЫЦЬ, НА ЖАЛЬ, УСЁ МЕНШ БЕЛАРУСАЎ? ЯК ЗАЦІКАВІЦЬ ГЭТАЙ ПРАБЛЕМАТЫКАЙ МОЛАДЗЬ? ЧЫМ СЁННЯ МАГЛО Б ІСТОТНА ДАПАМАГЧЫ РОДНЫМ МОВАМ МАЛАДОЕ ПАКАЛЕННЕ? ЯКУЮ РОЛЮ АДЫГРЫВАЕ ЛІТАРАТУРА XXI СТАГОДДЗЯ Ў ЛЁСЕ НАШЫХ РОДНЫХ МОЎ? ШТО ДЛЯ ВАС ЗНАЧАЦЬ ПАНЯЦЦІ: «МОЎНЫ ПАТРЫЯТЫЗМ», «ЭКАЛОГІЯ МОВЫ», «МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ»? ДА СУСТРЭЧЫ ЗА ДЫСКУСІЙНЫМ СТАЛОМ, СЯБРЫ!
www.pisateli.by


ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
прадстаўляе:
ГРАМАДСКІ ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ
АДРОМ»
teli.by



Намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Аліна Віктараўна Салімава



Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Таццяна Вітальеўна Паўлюкевіч



Настаўнік гісторыі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Іна Валер’еўна Соркіна





Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Людміла Антонаўна Кебіч



Выступае наш новы сябра, юны журналіст Арсень Шыцік (ГрДУ імя Янкі Купалы)





Выступае У. Я. Ягорычаў







Выступае І. В. Соркіна




Багацце матчынай мовы



Выступае С. У. Судзіна







Кандыдат у СПБ, пісьменніца-педагог  І. А. Салата



Выступае Н. П. Домань



Г. І. Садоўская








ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ
прадстаўляе:
ГРАМАДСКІ ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ














Русалчына






***[СЛОВАДРОМ]** # 72*
*Фота* **Анатоля Апанасевіча і Юліі Чамярыс**






Фотарэпартаж пра пасяджэнне «Словадрома» на сайце гімназіі

Рэпартаж Арсеня Шыціка на сайце газеты «Гродзенская праўда»